# ЗМЕСТ

**АЛЯКСАНДРА ЖАЛЯЗНОВА.** Зоры цябе шукаюць. *Вершы* . . . . . 3
**ІРЫНА ЛІННІК-ДУДАРАВА.** Спеў маўкі. *Апавяданне* . . . . . . 6
**ВІЯЛЕТА МІЦКЕВІЧ.** Позняя восень. *Верш* . . . . . 11
**АНГЕЛІНА НАРУК.** Барвяная лілея. *Апавяданне* . . . . . 12
**МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ.** Ваўкалакі. *Неагатычны раман. Працяг* . . . . . 20
**ВІКТОРЫЯ СОН.** Нябесная музыка. *Вершы* . . . . . 42
**ПАЛІНА ДВАРАНСКАЯ.** Планы сэрца. *Вершы* . . . . . 43

**ІНТЭРВ'Ю**
**ВІКТОРЫЯ КЛЯЎКО.** Праз тэкст — да памяці . . . . . 46

**З МАЛАДОСЦЮ Ў СЭРЦЫ**
**АЛЕСЬ БАДАК** . . . . . 56
**ГАННА НАВАСЕЛЬЦАВА** . . . . . 61

**ПЛЮС-ВАЙБ**
**АРЫНА ПРАНІКАВА.** На доўгім шляху ў Хельхейм: натхненне ў смерці . . . . . 71

**З АРХІВАЎ**
Лісты Уладзіміра Караткевіча Леаніду Васіленку . . . . . 77

**МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ**
**МІКОЛА ТРУС.** Захавальнік гістарычнай спадчыны — Рамуальд Зямкевіч . . . . . 82

**AUTOFICTION**
**АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ.** Гарады. Асабістыя ўражанні . . . 89
**МАРЫЭТА РЭПНІНА.** Эсэ . . . . . 103

**МАСТАЦТВА**
**КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ.** Стаўка на зэро, або Вырошчванне лудамана . . . . . 105



# АЛЯКСАНДРА ЖАЛЯЗНОВА

## Зоры цябе шукаюць

Вершы

*Жалязнова Аляксандра нарадзілася 7 ліпеня 1999 года ў Гомелі. Скончыла факультэт міжкультурных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта замежных моў. Друкавалася ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Пераможца міжнароднага літаратурнага конкурсу «Першацвет», рэспубліканскага паэтычнага конкурсу імя Міколы Мятліцкага. Жыве ў Мінску.*

### Мой свет

Мой свет складаецца з імгненняў
Ды моцнага жадання жыць,
З крыніцы думак і натхнення.
Не існаваць, не проста быць,

Хачу я ладзіць дом, прастору,
Ствараць свой лёс і зорны час.
І хвалямі буйнога мора
Цяплом кранаць любога з вас.

Пісаць балады пра знаёмых,
Людзей вядомых, дарагіх...
І льецца песняю маёвай,
Вадой празрыстаю ракі

Уласнае маё сумленне,
Мой гонар, годнасць ды спакой.
Мая душа — маё карэнне.
Не будзе іншай больш такой.

Не будзе дня, не будзе ночы,
Не будзе цемры і святла,
Калі ты жыць зусім не хочаш,
Чакаеш толькі, каб мятла

Launched Ператварыла свет у пекла,
Краіну болю ды пакут,
Мячом душу тваю пасекла...
Ды раптам знойдзеш родны кут.

Сваё заўсёды адшукаеш,
Палюбіш у мільённы раз,
Па першых кропельках пазнаеш...
Нарэшце добры стане час.

### Душа вясны жадае

Душа вясны жадае
Ды спеваў салаўёў,
Сярод мясцін блукае
І розных гарадоў

У пошуках прытулку,
Радзімага кутка



# ІРЫНА ЛІННІК-ДУДАРАВА

## Спеў маўкі

Апавяданне

***Ліннік-Дударава Ірына нарадзілася 17 красавіка 1991 года ў Мінску. Скончыла Cesar Ritz College (Швейцарыя) па спецыяльнасці «гасцінічны бізнес і турызм». Піша прозу. Аўтар двух раманаў «Падзенне ў пясок» і «Грахі і малітвы». Фіналіст конкурсу «Open Eurasian Literary Festival & Book Forum» у намінацыі «Лепшы твор для дзяцей» (2021). Жыве ў Мінску, працуе тэхнічным пісьменнікам.***

Яцэк імчаў па лесе ўжо трэцюю гадзіну. Каравай хлеба, які ён сцягнуў з прылаўка, даўно астыў і цяпер непрыемна ліп да голай скуры пад кашуляй. Сама ж кашуля, паношаная, у латках, наскрозь прамокла ад поту, і мужчыну здавалася, што за ім ад самай вёскі цягнецца ўдушлівы шлейф, які, несумненна, павядзе па следзе сабак. І хоць сабак за ім зусім не было, перапалоханаму Яцэку здавалася — яны на хвасце, вось-вось іх моцныя белыя іклы ўчэпяцца ў знямоглыя ногі…

Раптам ён спыніўся як укапаны. Каравай выкаціўся з-пад кашулі, і мужчына тут жа схапіў яго ды прыціснуў да сябе, як найвялікшы скарб на свеце. Але на каравай Яцэк не глядзеў, увагу прыцягнула хатка, што стаяла перад ім. Самая што ні ёсць сапраўдная, крыху перакошаная, яна выглядала так, быццам будавалася спехам. Замест канька на даху месціўся груба выразаны драўляны крыж, а вакол хаткі стаяў хілы частакол — якая-ніякая агароджа ад дзікіх звяроў. Зямля за частаколам выглядала дагледжанай, і Яцэк заўважыў некалькі курэй, якія мітусліва клявалі штосьці з зямлі.

Доўга не разважаючы, мужчына кінуўся да дзвярэй і пачаў грукаць у іх кулакамі.

— Адкрыйце, у імя Госпада, малю вас!

За дзвярыма пачулася шорганне, а пасля яно сціхла, нібы чалавек па той бок вырашаў, як яму паступіць. Нарэшце, адтуль пачуўся кашаль, і сіплы голас спытаў:

— Гэта яшчэ хто?

— Яцэк мяне завуць! — той загрукаў у дзверы яшчэ мацней.— Сабакі за мной! Прашу: дапамажыце!

— Ах, саба-а-а-акі…— пацягнулася за дзвярыма, а потым яны раптам адчыніліся, натужна пры гэтым зарыпеўшы.

Перад Яцэкам стаяў стары, як свет, дзед з бляклымі вачыма. Апрануты ў механатую цёмную адзежу, ён быў сівы і ўвесь зморшчаны. Толькі адпаліраваны драўляны крыж дыхаў жыццём на яго грудзях. На імгненне Яцэку здалося: крыж — адзінае жывое, што засталося ў тым чалавеку. Настолькі ён выглядаў стомленым і хворым.



# АНГЕЛІНА НАРУК

## Барвяная лілея

Апавяданне

***Нарук Ангеліна нарадзілася 14 ліпеня 2007 года ў Гомелі. Студэнтка другога курса філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны па спецыяльнасці «беларуская філалогія». Піша навуковыя і крытычныя артыкулы па літаратуры, рэцэнзіі, прозу. Артыкулы публікаваліся ва ўніверсітэцкіх выданнях, матэрыялах навуковых канферэнцый і ў часопісе «Бярозка». З'яўляецца членам моладзевага крыла рэдкалегіі часопіса «Бярозка» і ўдзельніцай «Школы маладога літаратара», арганізаванай рэдакцыяй. Жыве ў Гомелі.***

У склепе стаяў салодкі пах лілей. Мядовы, п'янкі водар намагаўся прагнаць смерць. Але тут знаходзіліся яе ўладанні. Пяшчотным покрывам рассыпаліся кветкі па прыступках, каменнай падлозе.

Вадаспады лілей белым саванам ахуталі труну. З барвовага, быццам старое віно, аксаміту, вышытая перлінамі і бісерам, што ўтваралі дзівосныя спляценні і спавівалі візэрункамі яе ўсю. Труна была падобна хутчэй да куфэрка паненкі, дзе захоўваліся яе маленькія радасці — залатыя пярсцёнкі, дыяментавыя каралі, брошкі з мудрагелістай вышыўкай,— а не да месца, дзе знайшла спачын душа маладзіцы.

Праз каляровае вітражнае акно заглядвала дзённае святло. Яно расквечвала вільготны і мёртвы змрок сутарэння: надавала беласнежным лілеям чырвонае, фіялетавае, ружовае адценне, грала з бісерам на труне так, што той іскрыўся-зіхацеў пад промнямі, як зоркі ў месячную ноч.

Штучным у гэтым пакоі было не пышнае аздабленне. Штучнай была смерць. Настолькі яна казалася тут недарэчы. Склеп меў падабенства з палацам князёўны — багаты, яркі, напоўнены духмянымі кветкамі. Здаецца, і сама прыгажуня толькі спіць у аксамітным ложку і хутка з'явіцца верны рыцар, што пацалункам абудзіць яе ад соннага закляцця. А ён ужо тут, напагатове, і родавая шабля зіхаціць пры левай руцэ, пагражаючы кожнаму, хто асмеліцца нанесці шкоду яго каханай. Ды казцы не суджана збыцца: князёўна спачыла навек.

Забіты горам муж штодня прыходзіць у склеп, стаіць пры труне, укленчыўшы, размаўляе з памерлай, плача. Тыя, хто мінае, чуюць апантаныя воклічы, вуснамі яго прамаўляе роспач:

— Ядвіся, ты чуеш мяне? Вярніся, прашу! Туга не дае мне жыцця, увесь свет апрыкраў без цябе. І сам я, нібы мёртвы, сноўдаюся змрочным ценем. Адзінае, што прымушае прачынацца штораніцы,— наша Саламейка. Яна прыбягае да мяне, заскоквае ў ложак, ласкава туліцца, як кацяня, заглядае ў вочы і ціха пытае: «А калі мама вернецца?» І, калі

бачыць, што па шчаках маіх струменяцца слёзы, прыпадае да грудзей і несупынна плача. Мне цяжка яе супакоіць, малая не слухаецца і крычыць праз рыданні: «Я хачу да мамы! Хачу на ручкі да мамы! Адвядзі мяне да яе! Адвядзі!» А я не магу прывесці дачку да тваёй труны. Не магу, не магу… Ядвіся, вярніся. Мы жудасна сумуем. Адзінае, чаго хачу,— гэта каб ты была побач. Каханая!..

Адказам няшчаснаму было глухое рэха сутарэння.

Так цяклі аднастайныя, атручаныя стратай дні. Пан Адам стаў пустэльнікам, нікога да сябе не пускаў, нікога не хацеў бачыць. Служкі, што спрабавалі падступіцца да ўдаўца ці патурбаваць дробязнымі гаспадарчымі клопатамі, сустракалі абыякавы, халодны позірк. Жыццё ў маёнтку быццам спынілася.

Выключэннем аказаўся стары садоўнік Міхал, які кожную раніцу выконваў адно і тое ж даручэнне: зразаў вялізныя букеты беласнежных, бы вытачаных з мармуру, лілей і прыносіў іх да ганка мураванага склепа. За парог пан Адам не пускаў нікога, усё рабіў сам: выкідваў кветкі, што ўжо завялі, водарным покрывам рассцілаў на іх месцы новыя, запальваў свечы, чытаў пацеры. Нягледзячы на тое, што на двары ўладарыў пранізлівы і туманны лістапад, у аранжарэях Рэйтанаў лілеі красавалі, як улетку.

Адзіны жывы чалавек, які прыцягваў увагу пана Адама і адчайна патрабаваў яго любові, была дачушка Саламейка. Пасля смерці маці дзяўчынку даручылі служанкам, што знаходзіліся з малой ад світання да захаду сонца. Увесь час яе бацька праводзіў з жонкай, у склепе…

Гарэзніца збягала з дзіцячага пакоя да яго раніцай, пакуль нянечкі яшчэ спалі, ці ўначы, калі прыкмячала запалены агеньчык у акне насупраць. Пан Адам штораз наракаў на дачку, што тая бегае басанож па халоднай каменнай падлозе і можа захварэць. Ды доўга абурацца на свайго маленькага анёлка не мог — сціскаў у абдымках. Гэта былі хвіліны палёгкі сярод пякельнага болю.

Але сёння звыклы парадак змяніўся. Пан Адам, як заўсёды, правёў дзень з любай нябожчыцай і, калі цьмянае сонца паглынуў глухі восеньскі змрок, пагасіў свечы ў склепе. У гэты раз накіраваўся не ў спальню. У звязцы старых, пашчэрбленых часам ключоў знайшоў патрэбны — цяжкія дубовыя дзверы кабінета са скрыпам адчыніліся. Мужчына запаліў свечку і сеў за пісьмовы стол. Змахнуў рукавом пыл — у паветры ўзнялося шэрае воблака. Пан Адам не быў тут больш за месяц: калі жонка цяжка захварэла, не адыходзіў ад яе ложка. А пасля смерці пані Ядвігі зусім забыўся пра справы маёнтка.

Ды і зараз праца яго не цікавіла. Мужчына дастаў з шуфляды стосік паперы. З-пад пяра выходзілі наступныя радкі:

«Дарагі Людвік!

Даруй мне, што не адказваў на твае старыя лісты і знік на цэлую вечнасць. Хаця для вялікага свету гэта, можа, толькі імгненне. За сваёй працай, дружа, ты, напэўна, не заўважаеш, што прайшоў тыдзень-другі. Для мяне цяпер дні цягнуцца, нібы стагоддзі. Стараюся аправіцца дзеля дачкі, але сіл не знаходжу ні на што. Балюча бачыць яе труну, партрэты, ведаючы, што не сустрэнеш ніколі зноў. Не магу ў тое паверыць.

І штодня мяне грызе адно і тое ж пытанне: за што? Ядвіся была такая маладая і раней ніколі моцна не хварэла. А потым аслабела так — ніводны лекар не змог дапамагчы. Згасла, як слабая іскрынка, у мяне на руках. І я не ведаю, ці меўся шанц выратаваць маю каханую. Сумняваюся і зараз. Калі такі адораны медык і навуковец, як ты, не змог даць рады. Хаця, калі б у цябе атрымалася прыехаць і агледзець Ядвісю, упэўнены, ты б знайшоў цудадзейны сродак. Ды з сонечных берагоў Італіі дабрацца ў наш закінуты край і за пару тыдняў не выпадае. Ты б не паспеў, нават калі б спяшаўся.

Усё адно дзякую, што ўвесь час быў на сувязі, дапамагаў чым мог, дасылаў доўгія лісты з выпіскамі са старых талмудаў і вялізнымі спісамі парад. Я ўсё чытаў, ды не мелася часу адказаць. Намагаўся выканаць іх усе, раіўся з дактарамі, не адыходзіў ад жонкі. А потым пахаванне… Жалоба і мяне ахінула

# ІНТЭРВ'Ю



# ВІКТОРЫЯ КЛЯЎКО

## Праз тэкст — да памяці

Сучасная пісьменніца павінна не толькі пісаць кнігі. Каб яе заўважылі, каб чытачы знайшлі да яе дарогу, трэба быць і маркетолагам, і піяршчыкам, і рэкламшчыкам, а яшчэ — вельмі смелым чалавекам, гатовым адкінуць уласныя страхі і рушыць услед за марай. Раман «Вырай» Вікторыі Кляўко — найярчэйшая падзея літаратурнага працэсу Беларусі за мінулы год. Першы вялікі тэкст пісьменніцы — і адразу перамога ў конкурсе «LitUP», дадатковыя тыражы, бурнае абмеркаванне ва ўсіх сацыяльных сетках і чытка ў Купалаўскім тэатры. Вікторыя праводзіць сустрэчы з чытачамі, стварае мерч, заканчвае вучобу ў Літінстытуце, рыхтуе да публікацыі другі рукапіс і чакае трэцяе дзіця. А яшчэ яна заснавальніца кніжнага клуба «МоноЛИТ36», а таксама прыклад для ўсіх маладых аўтарак: каб пра твой тэкст даведаліся, трэба прыкладаць намаганні, спрабаваць незвычайныя маркетынгавыя хады і, самае галоўнае, не баяцца. Гэтая размова — пра тое, чаму вёска ніколі не сыдзе з беларускай літаратуры, пра тое, як правільна спраўляцца з крытыкай, пра містыку, якая нагаляе ў моманты заняпаду, і пра сілу падтрымкі, якая не дае ўпасці.

### Рамантыка і тыражы

**— Ваш раман — пра вяртанне дадому. А якім быў ваш шлях у літаратуру?**

— Я з дзяцінства пісала. І ўжо тады заўважыла, што для мяне вельмі важна, каб кніга была не ў адным экзэмпляры,— хвалявалася за тыраж. Сама друкавала, сама прашывала, і вось атрымлівалася, што нават адна казка мелася ў мяне ў двух асобніках!

**— А сям'я падтрымлівала такое захапленне?**

— Не магу сказаць, што падтрымлівала актыўна, бо ніхто з сям'і не меў творчай прафесіі. Але ніколі не забаранялі займацца тым, што падабаецца. Аднак дзесьці ўнутры мяне трымалася ўстаноўка: пісьменнік — гэта несур'ёзна, звязваць сваё жыццё з такой працай — немагчыма. І ўсё ж я была сярод літаратуры: вучылася ў філалагічным класе, паступіла ў БДУЗМ (раней — МДЛУ) на настаўніцу англійскай і французскай мовы і літаратуры. Чытала шмат,

МУЗЕЙНАЯ ГАСЦЁЎНЯ

# МІКОЛА ТРУС

## Захавальнік гістарычнай спадчыны — Рамуальд Зямкевіч

Асобы, якія ўвайшлі ў гісторыю Беларусі як збіральнікі, калекцыянеры, маюць спецыфіку свайго рэтраспектыўнага бачання. Сабранае і выдадзенае сёння вельмі часта ўспрымаецца як дадзенасць, пры гэтым роля энтузіяста сваёй справы становіцца вядомай толькі для вузкіх спецыялістаў.

Да такіх асоб адносіцца і сёлетні юбіляр Рамуальд Зямкевіч (1881—1944), бібліёграф, публіцыст, гісторык беларускага пісьменства. Інфармацыі пра яго спакваля большае ў сеціве, а таксама пры публікацыі выяўленых архіўных крыніц. Запачаткоўваюцца новыя, у тым ліку нетрывіяльныя, ракурсы бачання асобы і біяграфіі.

Наша задача звярнуцца да некаторых жыццяпісных акцэнтаў, першакрыніц, якія па-рознаму сведчаць эпоху і чалавека. Месца іх захавання — фонд старадрукаў і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей — ЦНБ НАН Беларусі).

### Графіня

Пра тое, як у адной сям'і ў першых дзесяцігоддзях XX стагоддзя паяднаўвалася грамадска-значнае і прыватна-сямейнае, сведчыць, напрыклад, ілюстраваны часопіс



Рамуальд Зямкевіч, Гальяш Леўчык, Людвіка Сівіцкая. Варшава, 1913 або 1914 год. Калярызацыя Максіма Крэнца

«Беларускае жыццё» (1920, № 1; 19 студзеня), што выдаваўся ў Мінску.

На першай старонцы партрэт славутага кампазітара, на дзвюх наступных надрукаваны артыкул Рамуальда Зямкевіча «Станіслаў Манюшка і беларусы», праілюстраваны выявай загалоўнай старонкі першага выдання «Сялянкі» (Вільня, 1846). Далей змешчаны фотаздымак старога тэатра Поляка ў Мінску, у якім у 1855 годзе быў пастаўлены названы твор Марцінкевіча і Манюшкі.

І ў гэтым жа нумары «Беларускага жыцця» быў апублікаваны некралог, прысвечаны памяці жонкі даследчыка. Паколькі тэкст утрымлівае шмат невядомых фактаў з біяграфіі адметнай постаці беларуска-польскага культурнага памежжа, варта прывесці яго поўнасцю:

«6-га снежня г.<этага> года[1] ў Вільні памерла Лявонія з графаў Дунін-Баркоўскіх Зямкевічава. Нябожчыца — жонка нашага гісторыка, бібліёграфа і крытыка, пана Рамуальда Зямкевіча — добра была вядома ў беларускім руху 1905—1911 гадоў. У яе перахоўваўся архіў «Беларускай Сацыялістычнай Грамады», які ў 1911 годзе нябожчыца аддала загадчыкам Грамады, дзеля таго, што сама больш перахоўваць папераў не магла, з прычыны рэдактарства сацыял-дэмакратычнага тыднёвіка ў польскай мове «Swiatło».

За артыкулы пацягнулі Лявонію Дунін-Баркоўскую ў суд, але пакуль суд пачаў разбіраць справу — 29 кастрычніка 1912 г.— яна выйшла замуж і, здавалася, што змяніўшы прозвішча, можна было ўжо спакойна выехаць і абыйсці кару: сасланне ў Сібір. Але аб гэтым данеслі паліцыі, пасля чаго ўзялі падпіску, што віноўная нікуды з Вільні не выедзе. Суд цягнуўся колькі месяцаў, пакуль, у 1913 г., царская амністыя з прычыны 300-лецця дому Раманавых звольніла яе зусім ад кары.

Лявонія Зямкевічава радзілася на Беларусі ў Клевіцы, Ашмянскага павета, 29-га снежня 1882 г. Пражыла 36 гадоў. Асірацела двое недалетак.



Лявонія Зямкевіч (Дунін-Баркоўская). «Беларускае жыццё», 1920 год. № 1 (23). Калярызацыя Максіма Крэнца




Вокладка кнігі Р. Зямкевіча «Ян Баршчэўскі...» (Вільня, 1911)

[1] Імаверна, у тэксце абдрукоўка, мелася на ўвазе 6 студзеня 1920 г.